


# Новая эпоха ў гісторыі беларускага буквара

**3 верасня ў рамках святкавання Дня беларускага пісьменства ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прэзентавалі новы буквар, падрыхтаваны Нацыянальным інстытутам адукацыі. Вучэбны дапаможнік быў выдадзены спецыяльна да 2021/2022 навучальнага года для школьнікаў 1 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання.**

Новы буквар адрозніваецца багатым нацыянальным кантэнтам: у выданне ўключаны заданні і практыкаванні, якія адлюстроўваюць каштоўнасці беларускага народа, асабліваасці яго культуры. Яшчэ адна адметнасць буквара — насычанасць дадатковым медыякантэнтам, у прыватнасці, спасылкамі ў выглядзе QR-кодаў на серыю мультыплікацыйных фільмаў пра літары беларускага алфавіта.

З вітальным словам на прэзентацыі выступіла дырэктар Нацыянальнага інстытута адукацыі Валянціна Гінчук. Яна адзначыла, што ў новым буквары акумулявана метадычная думка многіх пакаленняў вучоных Беларусі. Намеснік генеральнага дырэктара дырэктар па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Аляксандр Суша павіншаваў прысутных з унікальнай падзеяй — пачаткам новай эпохі ў гісторыі беларускага буквара.

— Беларускі буквар — адзін з брэндаў Беларусі, сімвал велічы і годнасці нас і нашых продкаў, нашай культуры ў цэлым, — упэўнены Аляксандр Суша. Ён прыгадаў гісторыю беларускага буквара, якая налічвае больш за 400 гадоў, а таксама буквар Анатоля Клышкі, па якім з 1969 года і да пачатку гэтага навучальнага года вывучалі алфавіт беларускія першакласнікі.

— Самыя папулярныя і самыя тыражныя буквары ў многіх краінах у розныя стагоддзі ствараліся беларусамі, — падкрэсліў Аляксандр Суша.

Мультыплікацыйныя фільмы, спасылкі на якія змешчаны ў новым буквары, ствараліся ў кінастудыі "Беларусьфільм". Яе генеральны дырэктар Уладзімір Карачэўскі заўважыў, што першакласнікі цяпер змогуць вывучаць беларускую мову з дапамогай не толькі кніг, але і мабільнага тэлефона: дастаткова навесці яго камеру на QR-код і можна глядзець беларускамоўны мультфільм пра адну з літар.

Пры гэтым вучням не абысціся, канечне, без таленавітых настаўнікаў. Дэкан факультэта пачатковай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Наталля Ждановіч адзначыла важнасць розных поглядаў на методыку навучання школьнікаў — вучоных, кандыдатаў педагагічных навук і настаўнікаў-практыкаў.

Калі ў людзей ёсць буквар, то ў народа вялікая будучыня, і зараз мы назіраем нараджэнне новага буквара, — рэзюмавала Наталля Ждановіч.

Адзін з аўтараў новага вучэбнага дапаможніка, дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Вольга Свірыдзенка бліжэй пазнаёміла гасцей прэзентацыі з самім букварам. Так, ён працягвае лепшыя традыцыі класічнай методыкі навучання, якія закладзены Анатолем Клышкам, Усяславам Гарэцкім, Анатолем Шанько, але і ўтрымлівае якасна новы вучэбны матэрыял, які рэалізуе ідэю развіццёвага навучання. Дыдактычныя гульні, рэбусы, гукавы аналіз слова на аснове асваення спосабаў дзеяння, новая сістэма фарміравання і адпрацоўкі навыку чытання, заданні на фарміраванне чытацкай пісьменнасці — толькі цікавым і актуальным зместам напоўнены новы буквар для першакласнікаў. Яшчэ дзеці сустрэнуць у ім казачных герояў: Кірыліцу (яна пазнаёміць з новай літарай, запросіць на прагляд мультфільма пры дапамозе QR-кода, растлумачыць значэнне незразумелага слова), Жэўжыка (ён не ўмее чытаць, а першакласнікі дапамогуць яму навучыцца), Бома і Біма (пазнаёмяць з цвёрдымі і мяккімі зычнымі гукамі, навучаць перадаваць іх на пісьме пры дапамозе літар, пакажуць, як прачытаць склады і словы з цвёрдымі і мяккімі зычнымі гукамі). Старонкі буквара аздабляе беларускі арнамент: сімвалы дзіцяці, маці, сонца, дрэва жыцця.

Другі аўтар новага буквара, вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі пачатковай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Вольга Цырынава адзначыла, што выданне будзе суправаджаць цэлы вучэбна-метадычны комплекс: новыя прапісі з трэнажорамі і займальным матэрыялам, два дапаможнікі для настаўнікаў з падрабязнымі метадычнымі рэкамендацыямі, прыкладное каляндарна-тэматычнае планаванне з распрацоўкай усіх урокаў, дапаможнік для пазакласнага чытання, рабочы сшытак, "Спадарожнік буквара" (для дзяцей, якія ўмеюць чытаць). Гэта ўсё з'яўляецца перадумовай гарманічнага развіцця маленькага школьніка і яго імкнення да ведаў.

**Ягор ГЕРМЯНЧУК,**
**студэнт факультэта журналістыкі БДУ.**
**Фота аўтара.**